УТВЕРЖДАЮ
Директор учреждения образования
“Могилевский государственный
областной лицей № 1”
_____________П.В. Шилов
_____________2016 г.

Дата проведения: 6 февраля 2016
Время выполнения работы: 60 минут

Дыктант

**Палессе**

Палессе… Як шмат з табой сутыкнулася, пераплялося таго, што ідзе ад душы чулай і добрай! Ты выклікаеш у ёй самыя светлыя і чыстыя пачуцці сваімі людзьмі, прыродай, якіх шточасна мы спасцігаем, а спасцігнуць да канца так і не можам. Ты паступова, па кропельцы раскрываеш свае таямніцы, дзе багацця нямерана, незлічона. Яно бярэ пачатак з гістарычных далячынь і перадаецца з пакалення ў пакаленне як дарунак запаветны. Дар запаветны – гэта духоўнасць, самае святое, што ніколі, ні ў якія часы не страчвала сваёй каштоўнасці і ніколі не страціць.

Палессе – сапраўдная скарбніца старажытнай сялянскай культуры і прыроды. Тут, як нідзе, яшчэ захоўваюцца астраўкі, якіх асабліва не кранула цывілізацыя: уклад жыцця застаецца такім, якім быў на працягу стагоддзяў[1].

Але іх, гэтых астраўкоў, застаецца ўсё менш і менш. За мінулыя два-тры дзесяцігоддзі палескі край пачаў відавочна мяняцца. Гарадскую культуру немагчыма стрымаць – і яна беспераашкодна сягае ў самыя глухія куткі і паселішчы. На месцы старых хат будуюцца катэджы з усімі выгодамі.

Турава-Пінская зямля – сэрца ўсяго Палесся. Гэты край захаваў, збярог велізарнае багацце – рэдкія па дзівоснай прыгажосці краявіды, вялікую разнастайнасць расліннага і жывёльнага свету. (Паводле П.Сабіны)

(178 слоў)

**Заданне**

1. Зрабіць словаўтваральны разбор слова *Палессе.(1 бал)*
2. Зрабіць марфемны разбор слова *пераплялося.(1 бал)*
3. Запісаць транскрыпцыю слоў: *светлыя, немагчыма, катэдж, збярог, стагоддзе.* Указаць колькасць літар і гукаў у кожным слове. (5 балаў)
4. Пабудаваць схему сказа [1], падкрэсліць у ім члены сказа, назваць тып сказа (3 балы)